Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

5 ЛІСТАПАДА 2015 г. ЧАЦВЕР № 214 (28072) Кошт 2000 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

КАЛІ Ў ПОЛАЦКУ ДОЖДЖ

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Такі вось «агульны» парасон стаіць у скверы на праспекце Францыска Скарыны ў Полацку.

ЗАЎТРА — ІНАЎГУРАЦЫЯ ПРЭЗІДЭНТА

Цырымонія ўступлення на пасаду зноў абранага Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Аляксандра Лукашэнкі адбудзецца 6 лістапада 2015 года. Упершыню інаўгурацыя будзе праходзіць у Палацы Незалежнасці. У зале ўрачыстых цырымоній Аляксандр Лукашэнка прынясе Прысягу Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь і падпіша адпаведны Акт. Пасведчанне Прэзідэнта Кіраўніку дзяржавы будзе ўручана ў прысутнасці больш чым 1 тысячы запрошаных, сярод якіх вышэйшыя службовыя асобы краіны, дэпутаты Палаты прадстаўнікоў і члены Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу, кіраўнікі розных узроўняў, прадстаўнікі дыпламатычнага корпуса, замежныя госці.

Затым урачыстыя святочныя мерапрыемствы перамесцяцца на плошчу Дзяржаўнага сцяга Рэспублікі Беларусь, дзе ваеннаслужачыя прынясуць прысягу на вернасць беларускаму народу і Прэзідэнту. Па завяршэнні цырымоніі перад Кіраўніком дзяржавы ўрачыстым маршам пройдзе рота ганаровай варты.

З месца правядзення мерапрыемстваў будзе весціся прамая трансляцыя па ўсіх каналах беларускага тэлебачання. Яна пачнецца ў 12.00 (па мінскім часе).

Акрамя таго, з нагоды ўступлення на пасаду Прэзідэнта ў Палацы Рэспублікі адбудзецца святочны канцэрт «Разам у новы дзень». На галоўнай сцэне краіны выступяць дарослыя і дзеці, таленавітыя самародкі з глыбінкі і вядомыя беларускія артысты, а таксама славутыя землякі, якія жывуць у розных краінах свету, але аб'яднаныя любоўю да сваёй роднай Беларусі.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

ЦЫТАТА ДНЯ

Аляксандр ЗАБАРОЎСКІ, першы намеснік міністра эканомікі:

«Плануем садзейнічанне адзінаму рынку працы для павышэння эфектыўнасці размеркавання працоўных рэсурсаў пры ўмацаванні сістэмы сацыяльнай абароны. Ключавая навацыя — гэта пераход да праактыўнай палітыкі: абараняць не ўласна рабочыя месцы, а магчымасці людзей атрымліваць даход».

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 5.11.2015 г.

Долар ЗША	17413,00	▼
Еўра	19015,00	▼
Рас. руб.	277,17	▲
Укр. грыўня	752,59	▼

ISSN 1990 - 763X

У ЛІПЕНІ ГРОШЫ «ЗГУБЯЦЬ» 4 НУЛІ

Прэзідэнт падпісаў указ аб дэнамінацыі

Такім чынам, з першага ліпеня 2016 года ў краіне будзе праведзена дэнамінацыя афіцыйнай грашовай адзінкі Беларусі. Замену банкнот плануюць ажыццявіць з ліпеня па 31 снежня 2016 года. Аб гэтым гаворыцца ва Указе №450 «Аб правядзенні дэнамінацыі афіцыйнай грашовай адзінкі Рэспублікі Беларусь», які быў падпісаны кіраўніком дзяржавы 4 лістапада.

Замест банкнот узору 2000 года (што мы маем сёння) налета ў ліпені ў абарачэнне ўвойдуць грашовыя знакі ўзору 2009 года ў выглядзе банкнот і манет у суадносінах 10 тысяч «старых» рублёў да 1 беларускага рубля новага ўзору. Уводзяцца і манеты: новы рубель будзе роўны 100 беларускім капейкам узору 2009 года.

У падпісаным указе адзначаецца, што з 1 ліпеня па 31 снежня 2016 года «старыя і новыя» грошы будуць знаходзіцца ў паралельным абароце, абавязковым з'яўляюцца да прыёму пры ўсіх відах плацяжоў без абмежаванняў у паказаных вышэй суадносінах (1:10 тысяч).

СТАР. 2

■ Інавацыі

РАДЫКАЛЬНЫ ЗАСЛОН ВІРУСАМ І РАКУ,

або Як радыяцыйная хімія дапамагае фармацыі

Прафесар Алег ШАДЫРА адносіцца да тых вучоных, якіх называюць сталкерамі. Ён прызнаны ў навуковым свеце спецыяліст у галіне свабоднарадыкальнай і радыяцыйнай біяарганічнай хіміі. Стваральнік сучасных супрацьвірусных прэпаратаў, якія па эфектыўнасці не саступаюць найлепшым замежным аналагам. Больш як два дзясяткі гадоў Алег Іосіфавіч кіруе кафедрай радыяцыйнай хіміі і хіміка-фармацэўтычных тэхналогій у Беларускім дзяржаўным універсітэце. Пра тое, як была заснавана айчынная школа свабоднарадыкальнай хіміі, біялогіі і медыцыны і ў якім напрамку рухаюцца зараз навуковыя пошукі, мы гутарым з прафесарам...

— Алег Іосіфавіч, кафедра, якую вы ўзначальваеце, функцыянуе на стыку міждысцыплінарных ведаў. Радыяцыйная хімія і фармацыя — што паміж імі можа быць агульнага?

— Кафедра была створана амаль паўстагоддзя таму, каб рыхтаваць спецыялістаў, здольных вырашаць складаныя і разнапланавыя задачы па мірным выкарыстанні атамнай энергіі. У тыя часы яна называлася кафедрай радыяцыйнай хіміі і радыяхіміі. Адным з напрамкаў даследаванняў стала вывучэнне заканамернасцей уплыву радыяцыі на біялагічна важныя рэчывы. Пра магутнае разбуральнае ўздзеянне на жывыя арганізмы іанізуючых выпраменьванняў мы даўно ведаем, але механізмы гэтага працэсу ўсё роўна да канца не зразумелы. Разабрацца ў тым, якія згубныя рэакцыі выклікае радыяцыя пры апраменьванні арганізма, спрабуюць і хімікі, і фізікі, і біёлагі, і медыкі.

СТАР. 4